Centralna Komisja Egzaminacyjna

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

Układ graficzny © CKE 2010

**WPISUJE ZDAJĄCY**

**KOD** **PESEL**

*Miejsce na naklejkę z kodem*

dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

**MAJ 2013**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 12 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

**Czas pracy: 170 minut**

**Liczba punktów do uzyskania: 70**

*Część I – 21 pkt*
*Część II – 49 pkt*

MOB-P1_1P-132

## Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Дарыюша Шчэпаньчыка і адкажы на пытанні. Адказвай выключна на аснове тэксту і толькі сваімі словамі, або згодна з патрабаваннямі задання.**

Дарыюш Шчэпаньчык

***Таблаізацыя СМІ або журналістыка навыварат***
(скарочана)

1. Без таблоідаў мы б шмат чаго не ведалі. Аднак варта задумацца, ці страцілі б мы нешта важнае? Калі б не таблоіды, то мы пэўна ніколі не даведаліся б, што Анна Курнікава зацяжарыла ад Энрыке Іглесіяса, а Барыс Маісееў знайшоў сабе новага каханка. Магчыма, мы нават не ўяўлялі б, хто такі Барыс Маісееў. Дзякуючы таблоідам мы ведаем, колькі дзяцей маюць Анджэліна Джолі і Брэд Піт, і колькі з іх яны нарадзілі самі, а колькі ўсынавілі. Выснова простая: без таблоідаў мы б шмат чаго не ведалі. Аднак варта задумацца, ці страцілі б мы нешта важнае? [...]

2. Народзіны таблоідаў, якія раней называлі “бульварнаю прэсай”, сягаюць першай паловы XIX стагоддзя. Тады Бэнджамін Дэй, выдавец штодзённіка "New York Sun", заўважыў, што калі змяшчаць болей артыкулаў пра сэнсацыйныя здарэнні, то папулярнасць ягонай газеты рэзка павялічваецца. Чытачамі былі галоўным чынам рабочыя, сярод якіх усё шырэй распаўсюджвалася тады пісьменнасць. Павелічэнне тыражу прыцягвала ахвочых да лёгкага прыбытку рэкламадаўцаў, а гэта ў сваю чаргу дазволіла выдаўцу ўсталяваць кошт асобніка на ўзроўні аднаго цэнта. Гэта быў пачатак паўстання так званай Penny Press, “аднацэнтавай прэсы”, на набыванне і чытанне якой дазволіць маглі сабе ўсе. Па слядах Дэя пайшлі неўзабаве іншыя выдаўцы, і паміж імі распачалася зацятая барацьба за чытача. Газеты спаборнічалі ў паведамленнях пра забойствы ды іншыя злачынствы, пісалі пра прыродныя катаклізмы, катастрофы. Тады ўпершыню пачалі публікаваць артыкулы пра праблемы простых, звычайных людзей, а не толькі пра арыстакратыю. Варта адзначыць, што выдаўцы дбалі пра тое, каб інфармацыя была верагоднай і адпавядала рэчаіснасці.

3. Першыя таблоіды ў нашых краях паўсталі толькі на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Выдаўцы ставілі сабе мэту прыцягнуць увагу менш патрабавальнага чытача. Артыкулы ў газетах мелі быць кароткія, пісацца даступнай мовай і тычыцца спраў, блізкіх так званым простым людзям. І гэта ўсё. Аднак рэалізацыя гэтых сціплых і агулам станоўчых намераў, як і ва ўсім свеце, пачала набываць форму карыкатуры.

4. Правіла: адсутнасць правілаў. Сёння таблаізацыя закранула (у рознай ступені) усе віды СМІ: прэсу, радыё, тэлебачанне, а таксама інтэрнэт-парталы. Яе сутнасць можна звесці да некалькіх “святых” правілаў. Калі тэма не сенсацыйная, не скандальная, не кантраверсійная, або яе нельга падаць у такой форме – то гэтым не варта займацца. Таблаізаваныя медыі найбольш ахвоча цікавяцца асабістым жыццём палітыкаў або зорак шоу-бізнесу, парушаючы чарговыя межы іх інтымнага жыцця. Цікавяцца яны і звычайнымі людзьмі. Але пры ўмове, што іх гісторыі сапраўды моцныя, а часам жахлівыя (*“спадарыня Лідзія страціла мужа, нагу і пенсію”).* Мае попыт і розныя крывавы крымінал. Старая прыказка выдаўцоў кажа, што нішто так не ажыўляе газету, як труп на першай старонцы. [...]

**5.** Таблаізацыя звязаная з досыць адвольным стаўленнем да правілаў журналісцкай этыкі. Дапускаецца публікацыя не да канца праверанай інфармацыі, распаўсюджванне ці распусканне чутак, інакш кажучы стварэнне так званых медыйных фактаў. Аказваецца нават малаістотную інфармацыю можна раздзьмуць так, што яна становіцца прадметам сур'ёзных дыскусій і спрэчак. Навіну пра тое, што "сабака Саба, які належыць кіраўніку Сойму, бяскарна гуляе па польскім парламенце" некалькі дзён абмяркоўвалі ў прэсе, на радыё і тэлебачанні. [...]

**6.** У таблаізаваным паведамленні кідаецца ў вочы спрошчаная карціна свету, якая зводзіцца да падзелу на добрых і дрэнных, багатых і бедных, разумных і дурных. Гэта асабліва выразна бачна ў загалоўках ("Алкаголік вёз цвярозых", "Улада дагаджаць сабе рада", "Нажываюцца на крызісе"). Эфіры радыёстанцый поўняцца баявітымі анонсамі тыпу: *"Ужо праз хвіліну мы загонім у кут палітыка X або Y", "Рыхтуецца востры паядынак з дэпутаткай Z".* На тэлебачанні вядучыя кідаюць "Пяском у вочы", выклікаюць гасцей "Да бар'еру" ці на сімвалічны (прынамсі пакуль) паядынак на "Рынгу". Альбо арганізуюць чарговае ток-шоу, у якім тая самая зорка ў соты раз распавядае, ці носіць яна майткі. Таблаізацыя робіць рашучую стаўку на кароткія, простыя, часта прымітыўныя формы, каб занадта не абцяжарваць інтэлект гледача сур'ёзнай рэфлексіяй. [...]

**7.** Таблаізацыя ў СМІ вылучаецца спецыфічнай, далёкай ад літаратурнай мовай. Яна простая, агрэсіўная, у некаторых выпадках проста вульгарная. Сталаму гледачу цяжка ўспрыняць факт, што вядучы праграмы кажа свайму госцю: *Сціхні.* Магчыма, для шмат якіх малодшых гледачоў гэта проста доказ разняволенасці і прыклад файнай забавы.

**8.** Але вяртаючыся да інтэлекту чытача/гледача. Таблоідны зварот не заахвочвае да роздуму, а хутчэй падагравае эмоцыі. У падобных ньюсах інфармацыя адразу ацэньваецца і інтэрпрэтуецца аўтарам, што выразна супярэчыць прынцыпу неангажаванасці і аб'ектыўнасці. "Мяжа глупства і неадказнасці. Маці ў п'яным стане даглядала сына-інваліда". Журналіст яшчэ перад тым, як прэзентаваць факт, ужо паведаміў чытача, што ён павінен таго абурыць. [...]

**9.** Галоўныя рэдактары таблоідаў ды іншыя медыйныя прыхільнікі такой формы журналістыкі (яе элементы сустракаюцца ўжо нават у сур'ёзных выданнях і праграмах) часта хваляцца тым, што гэта запатрабавана большасцю грамадства. І ў якасці доказу прэзентуюць статыстыку аглядальнасці ці распроданага тыражу. Згода. Масавы глядач больш ахвотна паглядзіць рэаліты-шоу ці прачытае ў зручнай і таннай газетцы пра дэпутатку, якая набыла крыштальныя чаравічкі, чым будзе заглыбляцца ў таямніцы эканомікі, або аналізаваць новыя законапраекты. Калі захацець, то ў таблаізацыі СМІ можна нават знайсці нейкія станоўчыя моманты. Дзякуючы ёй многія менш адукаваныя людзі знаходзяць зразумелае тлумачэнне таго, што навокал іх адбываецца. Але нешта тут не так. І да канца невядома, ці гэта публіка вызначае, як павінны выглядаць СМІ, ці наадварот – гэта медыі фармуюць патрэбы публікі. Праўда, відаць, знаходзіцца пасярэдзіне.

**10.** Таблаізацыя вядзе да таго, што многія чытачы/гледачы маюць у галаве толькі гатовыя медыйныя слоганы і не ўмеюць самастойна думаць і ацэньваць рэчаіснасць. І адначасова ўплывае на якасць журналісцкага рамяства. Усё больш журналістаў успрымае сябе выключна як прадстаўнікоў псеўдаінфармацыі, якая мусіць здзіўляць, шакаваць, або даваць людзям звычайную забаву.

Дарыюш Шчэпаньчык, Таблаізацыя СМІ або журналістыка навыварат, Arche z dnia 10.02.2010.

## Заданні да тэксту

**Заданне 1** ***(2 пункты)***
На аснове 2 абзаца напішы, што прычынілася да паўстання таблоідаў. Падай два аргументы.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 2** ***(2 пункты)***
На аснове 2 абзаца напішы, што аўтар называе *аднацэнтавай прэсай* і адкуль гэтае акрэсленне.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 3** ***(2 пункты)***
У тэксце знайдзі словы, якія адпавядаюць дэфініцыям:

а) (2 абзац) колькасць экземпляраў якога-небудзь друкаванага выдання аднаго выпуску

.............................................................................................................................................

б) (2 абзац) падзея з трагічнымі выпадкамі, вялікае бедства

.............................................................................................................................................

в) (3 абзац) малюнак на якім нарысаваны хто-небудзь або што-небудзь у скажоным, падкрэслена смешным выглядзе ....................................................................................

г) (4 абзац) кароткае народнае выслоўе павучальнага зместу; народны афарызм

.............................................................................................................................................

**Заданне 4** ***(1 пункт)***
На аснове абзацаў 1 – 3 выбяры правільны адказ. Аўтар тэксту піша пра:
а) ролю таблоідаў і іх паўстанне;
б) правілы журналісцкай этыкі;
в) жыццё і праблемы арыстакратыі ў XIX стагоддзі;
г) уплыў рэкламы на папулярнасць газет.

**Заданне 5** ***(2 пункты)***
На аснове 4 абзаца напішы, якія існуюць правілы таблаізацыі.

1) .........................................................................................................................................

2) .........................................................................................................................................

## Заданне 6 *(1 пункт)*

На аснове 5 абзаца напішы, што называюць *медыйнымі фактамі*.

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

## Заданне 7 *(2 пункты)*

Падай рысы таблаізаванага паведамлення? Адкажы на аснове 6 абзаца.

1) ..............................................................................................................................................

2) ..............................................................................................................................................

## Заданне 8 *(2 пункты)*

Чым абумоўлена таблаізацыя ў СМІ? Адкажы на аснове 9 абзаца. Падай дзве рысы.

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

## Заданне 9 *(2 пункты)*

На аснове 10 абзаца растлумач, які ўплыў мае таблаізацыя на чытача/гледача, а які на журналіста.

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

## Заданне 10 *(2 пункты)*

На аснове 7, 8, 10 абзацаў зазнач, ці ніжэй дадзеныя сказы з'яўляюцца паводле аўтара праўдзівымі ці фальшывымі:

| | Праўда | Фальш |
|---|---|---|
| 1. Таблаізацыя ў СМІ вылучаецца складанай мовай. | | |
| 2. Паведамленні ў таблоідах маюць эмацыянальную афарбоўку і падаюць зінтэрпрэтаваную інфармацыю. | | |
| 3. Таблаізацыя ў СМІ вучыць чытача/гледача самастойна думаць і ацэньваць рэчаіснасць. | | |

## Заданне 11 *(2 пункты)*

На аснове тэксту Дарыюша Шчэпаньчыка растлумач загаловак *Таблаізацыя СМІ або журналістыка навыварат*.

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

**Заданне 12** ***(1 пункт)***

Які характар мае тэкст Дарыюша Шчэпаньчыка. Выбяры правільны адказ

а) мастацкі;
б) публіцыстычны;
в) навуковы;
г) юрыдычны.

## Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.

**Тэма 1: На аснове аналізу верша Янкі Купалы *Не шукай* выразі свой погляд: ці вартасці, пра якія гаворыць аўтар, актуальныя цяпер?**

Янка Купала

***Не шукай***

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі,
Гэт, за шумным лесам-борам,
За шырокім сінім морам
Не шукай ты шчасця, долі!

Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,
Там, дзе маці над калыскай
Табе песні напявала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці блізка!

Не шукай сабе дружакаў
Між чужынцаў, між піяўкаў,
Ні у месцы, ні ў палацы,
Ні пры лёгкай панскай працы, -
Не шукай ты там дружакаў!

Ты іх знойдзеш вельмі блізка,
Каля хаты, каля нізкай,
Дзе ганяў жывёлу змалку,
Дзе касой махаў на ранку,
Толькі ўмей шукаці блізка!

Не шукай сабе, мой братку,
З ветрам Бацькаўшчыну-матку
Ні на сушы, ні на моры,
Ні у шчасці, ні у горы,
Не шукай яе там, братку!

Яе знойдзеш вельмі блізка,
Як знаходзіць лес вятрыска,
Толькі ў сэрца глянь сваё ты
І ў душу заглянь з ахвотай,
Знойдзеш Бацькаўшчыну блізка!

*1913*

Янка Купала, *Не шукай*, [у:] Янка Купала, *Збор твораў у шасці тамах. Вершы і паэмы*, Мінск 1961, с. 193-194.

**Тэма 2: На аснове аналізу і інтэрпрэтацыі дадзеных фрагментаў *Споведзі* Ларысы Геніюш прааналізуй сувязь назвы твора з яго праблематыкай. Звярні ўвагу на постаці герояў і значэнне прасторы ў творы.**

Ларыса Геніюш

***Споведзь***
(фрагменты)

Благаславенны родны дом, гдзе бацькі і ўся дарагая сям'я. Благаславенны маленькі кусочак роднай, бацькавай зямлі на вялізнай планеце, які называўся Жлобаўцы. Называўся, бо сяння яго няма, таго нашага фальварачка, і нават яго назовы. Там калгас з нейкай ультрасавецкай назовай, дом перавезены ў Ваўкавыск, разам з гумном, а там, гдзе была наша сяліба, стаіць толькі даўгі мураваны хлеў і некалькі дрэў, якіх яшчэ не паспелі выкарчаваць на апал сяляне. [...]

Часам доўга ўглядаюся на сцежкі свае маладосці – ажываюць успаміны, і здаецца мне: спрацаваныя матчыны рукі туляць мяне ласкава да сэрца, алеяю, ці, як мы казалі, – прагонам, шырака крочыць тата, я яму толькі па бараду, і, угледзеўшы мяне, ён заўсёды ўсміхаецца пад сваімі крыху рыжымі вусамі, заўсёды падзеліцца думкамі накшталт: «Полацкае княства сяння зрабілі непапулярным са страху, каб не сепаравалася па праву ад імперыі, але ці ты думаеш, што твая Беларусь утрымаецца эканамічна, калі б была самастойнай?» Тата ведае чым жыву, і часамі хоча мяне паквяліць, як малое дзіця. Крыху спрачаемся, мае ідэі для яго, з дзядоў ужо нявольнага, як экзотыка. Тата ведае, чым за гэта плаціцца, і пaглядае на мяне з нейкай чуласцю сумнай.

Ксеня невяалікая, але з вялікімі цёмна-сінімі вачыма, чорнавалосая й зграбная, жыве сваімі законамі й любіць часам закурыць папяроску. [...] Ніна, вельмі прыгожая бландынка з зялёнымі вачыма, вельмі любіць танец. Недзе бачыла балет і доўга, пасучы гусей, танцавала свае дзіўныя танцы на пальчыках, з яе не смяяліся. Расьціслаў высокі, але яшчэ ня мэтар дзевяцьдзесят пяць, да якіх дарос у сталым веку. Ён вучыцца ў сельскагаспадарчай школе ў Жыровіцах, вельмі прыгожы, чулы, ціхі паслухмяны й працавіты, хоць яшчэ дзіця. Нейк, калі мы разам ехалі да Гудзевіч, сказаў мне свае пляны на будучыню, яны былі даволі дзіўныя. «Калі вырасту, дык вазьмем ад бацькоў часць зямлі, якая нам належыць з табою, і будзем разам гаспадарыць, ты будзеш садзіць кветкі, даглядаць хаты, а я пакажу ўсім, як трэба дабываць ураджаі, пасьля вазьмем да сябе бацькоў, і нам так будзе добра». Мілы, наймілейшы мой брат, Гэркулес з душою, як лютня. Здавалася яму, што пакінуць Жлобаўцы – гэта здрадзіць сваёй сям'і.

А зямля да нас гаварыла. Яна разумела нас, акружала духам мінуласьці ўсяго нашага народу й вялікай любоўю дрэваў, палёў. Ланы жыта хваляваліся проста пад вокнамі, і каласы шапацелі ад ветру. Нам было добра на весьнім сонейку, на дажджы й на ветры, весела крочылі мы ў кажушках сваіх зімою, і коні насілі нас у куліку па дарогах, на якія ласкава сьвяціў месяц.

Пасля быў Аркадзі, вечна вясёлы, стройны й з твару падобны на маму. Яго мы нейк любілі меней ад Славачкі. Вельмі бурным, гордым, сьмелым такім юнаком быў наймалодшы з хлопцаў Аляксей. Браты былі дружныя, любілі коней і мелі свае хлапцоўскія забавы. Але ны былі яшчэ дзеці, вучыліся, і найбольшым «хлопцам» удома была я. Усе справы з падаткамі, урадамі, даўгамі, крэдытамі ўскладаў тата на мае плечы. Ён не любіў такіх спраў, і я іх не любіла, але памагала тату, як толькі магла. Наша наймалодшая Людміла, Люсенька – як мы яе называлі, была раскошным дзецям, прыгожым, ласкавым і вельмі разумным. Была яна любоўю ўсёй сям'і, і ў яе маленькім сэрцайку было столькі ласкі да ўсіх, што мы яе падзіўлялі. Яна вельмі любіла мяне, болей як маму, і мы амаль не разлучаліся.

Я была найстаршай удома з дзяцей і, здаецца, найболей каханай бацькамі, брацікамі, Люсяй і слугамі. Ксеня й Ніна мяне не любілі. Новы вялікі дом, і ўсе ўдома. [...] Зямля была для нас усім: калыскай, хлебам, песняй, любоўю, магілай. [...]

Мне сумна, я многа тут пакідаю ў бацькаўскай сялібе, гэтым жыць буду вечна я й маё пяро. За сабою я пакідала ўлюбёны прастор палёў, якія мяне ўзгадавалі, труднае жыццё, нялёгкую працу ў полі й на вялікай гаспадарцы, тапалёвы гай ля хаты й лес, які сама садзіла. Ён так хораша рос і ўжо гадаваў маслячкі, рыжыкі. Тую вёску, якая мне столькі падсказала з мінулага, замурзаную крыху мо, але з душою, бы тая раса, якую я так разумела. Песні яе пайшлі следам за мною. І я пакідала сваю сям'ю й той пятачок зямлі на вялікай планеце, мае Жлобаўцы, гдзе я ніколі не сумавала й не трэба мне было ніякага таварыства, калі было поле, наш дом і лес; і весела сярод альшыны якраз праз нашыя лугі працякала любая рэчка Ваўпянка, поўная шчупакоў, плотак і багатая ракамі. Сумна мне будзе без таты, ён вельмі разумны, нейк усё бачыць, быццам адчувае наперад, толькі жаль мне, што Жлобаўцаў не разбудоўвае, не засаджвае болей садамі й лесам, жывецца там нейк з дня на дзень... Калі за нашай хатаю заходзіць сонца, дык робіцца аж страшна, быццам нехта адыходзіў назаўсёды. Халадок і ноч кладзецца на мае Жлобаўцы, як чорная небяспека, як прадчуццё таго, што пасля прыйшло. Вось і тата мой прадчуваў гэта ўсё відавочна й не разбудоўваў свой кут на вякі. Гэта ўжо здалёк рысавалася на небасхілах вайна і тое, што ходзіць з ёю.

Ларыса Геніюш, *Споведзь*, Мінск 1993, с. 5-15.

# CZYSTOPIS

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

# BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*